**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2018 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка міласэрнасці</u>**

**4 кастрычніка**

Бібліятэка сумесна з Домам культуры правяла тэматычны вечар «Нам года не помеха». Да мерапрыемства падрыхтавана выстава вырабаў чытачоў бібліятэкі «Рукам работа – праздник душе». Зроблены фотасправаздача акцыі дабра і міласэрнасці «Подари тепло пожилому человеку», фотавыстава «Возраст осени, ты дорог и прекрасен». На мерапрыемстве арганізавана ўшаноўванне лепшых чытачоў-ветэранаў.

Батчынская ПБ, 42 чал.

**10 кастрычніка**

Бібліятэка сумесна з сельскім клубам запрасілі пажылых жыхароў аграгарадка на музычна-паэтычны вечар «Святло дабра і міласэрнасці». Удзельнікі клуба «Крыніца» у паэтычнай форме павіталі гасцей, выказалі словы падзякі за іх шматгадовую працу, мудрасць і дабрыню. Госці з задавальненнем праслухалі музычныя нумары ў выкананні «Каралевы Восені» і вершы рускіх паэтаў, прынялі ўдзел у конкурсе «Узгадай і заспявай» і віктарыне аб прадметах народнага побыту.

Гарадзецкі філіял, 35 чел.

**17, 19 кастрычніка**

У час правядзення гадзіны дабрыні «Поделись теплом души своей» дзеці пазнаёміліся з заламі бібліятэкі «Библиотеку посещаем – любовь к книге прививаем», прагледзелі мультымедыйную прэзентацыю «Милосердие – наш девиз», паўдзельнічалі у гульне-віктарыне «Доброта», паэтычнай гульне «Словарь вежливых слов», гульне «Вежливо-невежливо», конкурсе «Доскажи словечко».

Дзіцячы філіял, 47 чал.

**18 кастрычніка**

На базе інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра ў рамках праекта «Бібліятэка без межаў» прайшла інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Музеі знакамітых персанажаў». Гасцямі сталі падапечныя дзённага знаходжання Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Вядучыя расказалі пра незвычайныя музеі фальклорных і літаратурных герояў, кінаперсанажаў. Мерапрыемства суправаджалася слайд-прэзентацыяй.

ЦРБ, 25 чал.

**21 кастрычника**

На уроке міласэрнасці «К добру – через книгу» навучэнцы малодшых класаў адправіліся ў падарожжа з казачнымі прыпынкамі па країне ветлівасці і дабраты. На станцыях «Добрые улыбки», «Сказочные герои», «Волшебные слова», «Добрая фея», «Доброта и вежливость» маленькія ўдзельнікі выконвалі прапанаваныя ім заданні, прымалі ўдзел у гульнях «Волшебные

слова», «Вежливо – невежливо» і інш. Паказана відэапрэзентацыя «Путешествие в страну Вежливости и Доброты».

Шамятоўская ПБ, 27 чал.

**22 кастрычніка**

Бібліятэка арганізавала і правяла праваслаўную сустрэчу з ігуменам Чаравачыцкай царквы айцом Міхалам. Святар расказаў прысутным пра восеньскія святы праваслаўнага календара, як адзначаюць іх праваслаўныя хрысціяне, пазнаёміў прысутных з пунктам гледжання праваслаўнай царквы на чытанне духоўнай літаратуры і адказаў на шматлікія пытанні прысутных. Да сустрэчы падрыхтавана кніжная выстава «Книги, которые меняют жизнь».

Батчынская ПБ, 65 чал.

## Мерапрыемствы да Дня маці

**10 кастрычніка**

На пасяджэнні клуба «Час і ты» «Ты одна мне несказанный свет…» перад навучэнцамі Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа выступіл святар Свята-Хрыстараждзественскай царквы г. Кобрына іерэй Андрэй Шаўчук і мнагадзетная сямья Мешчараковых. Прысутныя праслухалі вершы пра маму, прагледзелі відэакліп «Самый близкий человек». Прыемным сюрпрызам для гасцей свята сталі музычныя нумары, падрыхтаваныя вакальнай групай цэнтральнай бібліятэкі.

ЦРБ, 68 чал.

**13 кастрычніка**

У час правядзення літаратурна-музычнай кампазіцыі «Тепло сердец для мам любимых» удзельнікі ЛПГ «Крыніца» пазнаёмілі прысутных з гісторыяй узнікнення свята Пакроў Прэсвятой Багародзіцы. Дзеці чыталі вершы, выконвалі музычныя нумары. Бібліятэка адзначыла лепшых чытачоў-дзяцей дыпломамі і сувенірамі. Усім прысутным прадстаўлена кніжная выстава «Мама – святло маёй душы».

Імянінская ПБ, 68 чал.

**14 кастрычніка**

На выступленні літаратурна-паэтычнай групы «Натхненне» «Што ў нашым сэрцы самае святое» мамам адрасаваліся цёплыя словы віншаванняў, паэтычныя радкі, якія ў розныя гады прысвячалі жанчыне-маці паэты. Дзеці з вакальнага гуртка Гарадзецкага сельскага клуба дарылі мамам музычныя паштоўкі-віншаванні «З любоўю да матулі». Бібліятэкар правяла агляд кніжнай выставы «Быць маці - гэта шчасце».

Гарадзецкі філіял,75 чал.

**15 кастрычніка**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу і сярэдняй школай правялі конкурс паэтычнага чытання «Слова любви о маме». У мерапрыемстве прынялі ўдзел чатырнаццаць навучэнцаў, выразна дэкламаваўшых вершаваныя творы. Дзесяць лепшых удзельнікаў ўзнагароджаны дыпломамі і граматамі. Чытачы пазнаёміліся з кнігамі, прадстаўленымі на выставе «Пусть всегда будет мама».

Залеская ПБ, 28 чал.

**15 кастрычніка**

У час правядзення ўроку дабрыні для навучэнцаў 2-3 класаў «С любовью к маме» прадстаўлены агляд літаратуры пра маму, прэзентацыя «Памятники матерям». Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах «Собери пословицу», «Назови маму», адгадвалі загадкі, чыталі вершы, глядзелі мультфільм «Мама для мамонтёнка».

Арэхаўская ПБ, 21 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**10 кастрычніка**

"Усё жыццё ў падарожжы – ад першых да апошніх дзён" – пад такой назвай у СШ №8 г. Кобрына адбылося выступленне ЛПГ "Рытм", прысвечанае 105-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага паэта, празаіка, публіцыста, перакладчыка Сяргея Іванавіча Грахоўскага. Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў са старонкамі біяграфіі Сяргея Іванавіча, з цікавымі фактамі яго жыцця, з творчай спадчынай паэта. У канцы мерапрыемства вучні прынялі ўдзел у віктарыне "...Ад слова свеціцца жыццё".

ЦРБ, 72 чал.

**11 кастрычніка**

Адбылася творчая сустрэча з вучоным-гісторыкам, прафесарам, картографам, ураджэнцам в. Літвінкі Кобрынскага раёна Львом Раманавічам Казловым. У ходзе сустрэчы прайшла прэзентацыя юбілейнай выставы «Вандроўкі па ваколіцах мінулага», якая з 14 верасня функцыянуе ў інфармацыйна-сервісным цэнтры бібліятэкі. На мерапрыемстве прысутнічалі настаўнікі школ горада, супрацоўнікі ваенна-гістарычнага музея, бібліятэкі, члены гісторыка-краязнаўчай секцыі Кобрынскага ўніверсітэта «Залатога ўзросту», краязнаўцы.

ЦРБ, 48 чал.

**26 кастрычніка**

На базе інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра адбыўся раённы семінар кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі па тэме «Літаратурнае краязнаўства, яго роля ў грамадзянска-патрыятычным і духоўна-маральным выхаванні навучэнцаў». У рабоце семінара ўдзельнічалі гл. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі, спецыяліст аддзела бібліятэчнага маркетынгу. Госці пазнаёміліся з краязнаўчым інфармацыйным цэнтрам, выдавецкай работай краязнаўчага кірунку. Супрацоўнікі ЦБ расказалі прысутным пра краязнаўчыя рэсурсы бібліятэкі ў дапамогу навучальнаму працэсу, зрабілі агляд юбілейных літаратурных дат, правялі аглядную экскурсію па бібліятэцы.

ЦРБ, 48 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.

Тэл. 2 36 81